**Бурачонак Аляксандр Вячаслававіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# ПАЛІТЫКА Ў АДНОСІНАХ ДА ІНШАЗЕМНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ХІХ – ПАЧАТКУ ХХ ст.

Іншаземныя падданыя звыкла прымалі актыўны ўдзел у эканамічным жыцці Беларусі. Яшчэ з эпохі сярэднявечча гэтая тэрыторыя з’яўляліся месцам, куды ахвотна прыходзілі з прапановай і дзе маглі задаволіць попыт купцы з Заходняй Еўропы, Скандынавіі, Арабскага Усходу і іншых рэгіёнаў. З цягам часу спектр краін, якія мелі знешнеэканамічныя адносіны з тагачасным насельніцтвам беларускіх зямель, пашыралася. Пры гэтым паступова змяняўся і характар удзелу іншаземцаў у гаспадарчым жыцці гэтага рэгіёну – яны выступалі не толькі як удзельнікі гандлёвых аперацый, але і як фінансісты, а таксама арганізатары вытворчай справы. Істотныя змены ў іншаземнай актыўнасці назіраліся на тэрыторыі Беларусі ў час распаўсюджвання тут рынкавых адносін, калі замежныя падданыя актыўна імкнуліся заняць тыя нішы ў гаспадарцы беларускіх губерняў, якія па шэрагу прычын суб’ектыўнага і аб’ектыўнага характару заставаліся па-за ўвагай мясцовых жыхароў.

Наяўнасць іншаземных удзельнікаў рынку патрабавала ад расійскіх уладаў карэкціроўкі камерцыйнага заканадаўства. Кірунак праватворчай дзейнасці неаднаразова змяняўся, паколькі на працягу ХІХ – пачатку ХХ ст. характар урадавай палітыкі ў дачыненні да замежных прадпрымальнікаў у гэты час не быў статычным. Так, падчас крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы нормы, якія былі прыняты ў дачыненні да іншаземцаў, мелі яскравую пратэкцыяніцкую афарбоўку. Асновай такога кірунку стаў прыняты 1 студзеня 1807 г. «Маніфест аб дараваных купецтву новых выгадах, адрозненнях, перавагах і новых спосабах распаўсюджвання і ўзмацнення гандлёвых прадпрыемстваў». У адпаведнасці з дадзеным нарматыўным актам іншаземныя падданыя, як і мясцовыя жыхары, маглі рэалізоўваць свае бізнес праекты ў гарадской мясцовасці толькі пры ўмове ўваходжання ў адну з трох купецкіх гільдый. Аднак для атрымання такой магчымасці было неабходна стаць падданым Расійскай імперыі. У гэтых умовах патэнцыяльнаму прадпрымальніку прыходзілася выбіраць – захаваць вернасць сваёй дзяржаве або паспрабаваць свае сілы ў дзелавым свеце імперыі Раманавых у якасці мясцовага грамадзяніна. Фактычна Маніфест ад 1 студзеня 1807 г. быў скіраваны на змяншэнне канкурэнцыі мясцоваму купецтву, ініцыятыву якога ў той час усялякім чынам імкнуўся падтрымліваць урад. Аднак гэта не азначае, што іншаземцы былі пазбаўлены ўсіх гаспадарчых правоў – за імі было захавана права на ажыццяўленне аптовага гандлю, утрыманне як у гарадской, так і ў сельскай мясцовасці мануфактурных і фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, дзе выкарыстоўвалася вольнанаёмная праца [1, с. 973–975]. Агульнаімперскія пратэкцыяніцкія нормы былі распаўсюджаны і на тэрыторыю Беларусі, але з цягам часу тут атрымалі распаўсюджанне і дадатковыя абмежаванні ў дачыненні да разглядаемай катэгорыі насельніцтва. 8 студзеня 1820 г. быў прыняты заканадаўчы акт, у адпаведнасці з якім на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай іншаземцам, якія не мелі расійскага падданства або не былі зацверджаны ў дваранскім саслоўі, забаранялася набываць маёнткі з сялянамі [2, с. 9], што па сутнасці абмяжоўвала замежную ініцыятыву і ў сельскай мясцовасці.

Абмежаванні ў паўнавартасным доступе да занятку прадпрымальніцтвам з боку замежных падданых існавалі да другой паловы XIX ст. Толькі 7 чэрвеня 1860 г. быў прыняты заканадаўчы акт, у адпаведнасці з якім расійскае падданства больш не давала ранейшых прэферэнцый пры арганізацыі індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі Расійскай імперыі [3, с. 706–707]. Гэтыя нормы знайшлі пацвярджэнне і ў «Палажэнні аб пошлінах за права гандлю і іншых промыслаў» ад 9 лютага 1865 г. [4, с. 160]. Лібералізацыя заканадаўства ва ўмовах пераходу да капіталістычных адносін выглядала цалкам лагічным крокам расійскага ўраду, паколькі развіццё свабоднага рынку немагчыма ўявіць без наяўнасці таварна-грашовых і маёмасных адносін, якія заснаваны на фармальнай роўнасці бакоў.

Імкненне прыцягнуць у эканоміку краіны замежныя інвестыцыі ў форме асацыіраванага капіталу падштурхнула расійскі ўрад да падпісання шэрагу канвенцый з краінамі Заходняй Еўропы. Паводле гэтых дакументаў прызнавалася правыздольнасць іншаземных акцыянерна-паявых кампаній, якія маглі ажыццяўляць дзейнасць на тэрыторыі Расійскай імперыі па тых жа прынцыпах, што і ўласнарасійскія кампаніі. У 1863 г. адмысловая канвенцыя была падпісана з Францыяй, у 1865 г. – з Бельгіяй, у 1866 г. – з Італіяй, у 1867 г. – з Англіяй, у 1874 г. – з Германіяй [5, с. 33–34]. Аднак разам з пашырэннем пэўных свабод датычна іншаземных падданых у агульнаімперскім маштабе, гэты час для тэрыторыі Беларусі адзначыўся ўвядзеннем новых абмежаванняў. 14 сакавіка 1887 г. быў прыняты ўказ «Аб усталяванні асаблівых правілаў адносна набыцця іншаземцамі нерухомай маёмасці ў некаторых губернях заходняй паласы Расіі». Паводле гэтага нарматыўнага акту ў Бесарабскай, Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Курляндскай, Ліфляндскай, Мінскай і Падольскай губернях іншаземным падданым і замежным кампаніям былі забаронены набыццё і арэнда зямлі і кіраванне нерухомай маёмасцю па-за межамі гарадскіх населеных пунктаў. Выключэнне складалі выпадкі атрымання нерухомасці ў спадчыну ў прамой сыходнай лініі і паміж мужам і жонкай. Зразумела, што на перасяленцаў, якія прынялі расійскае падданства, дзеянне дадзенага нарматыўнага акту не распаўсюджвалася [6, с. 101–102].

Нягледзячы на існаванне пэўных абмежаванняў прававога характару, іншаземны капітал пранікаў у гаспадарку беларускіх губерняў. Тут праяўлялі сябе выхадцы з Вялікабрытаніі, Бельгіі, Францыі, Аўстра-Венгрыі, Турцыі і асабліва Германіі. Нямецкі вопыт гаспадарання быў запатрабаваны і ў маёнтку Парэчча Скірмунтаў, і ў маёнтку Шчорсы Храптовічаў, і на шэрагу фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў як у сельскай, так і ў гарадской мясцовасці на тэрыторыі Беларусі. Тэхналогіі, якія пранікалі ў беларускія губерні з Германскай імперыі, нярэдка давалі новае жыццё пэўным галінам вытворчасці. Так, напрыклад, выраб паташу на беларускіх землях ажыццяўляўся яшчэ з эпохі сярэднявечча. Але менавіта прадстаўнікі германскай фірмы «Шэрынг» здолелі арганізаваць на Выдрыцкім заводзе сухой перагонкі драўніны выраб фармаліну, драўнянага і метылавага спірту, воцатнакіслай вапны і іншых хімічных прадуктаў, якія збываліся ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Варшаве, Кіеве, Рызе, Лодзі і Адэсе [7, № 456Г, № 540Г]. Праўда з пачаткам Першай сусветнай вайны эканамічная дзейнасць немцаў, а таксама выхадцаў з іншых дзяржаў, якія ўваходзілі ў Траісты саюз, зведала істотныя змены.

Ужо 28 ліпеня 1914 г. Мікалай II падпісаў указ «Аб правілах, якімі Расія будзе карыстацца падчас вайны 1914 г.». У адпаведнасці з першым артыкулам

дадзенага заканадаўчага акта страчвалі юрыдычную сілу ўсе канцэсіі і іншыя дамовы льготнага характару, якія былі заключаны з варожымі краінамі. У дадатак да гэтага, згодна з дадзеным указам прадугледжвалася канфіскацыя на карысць дзяржавы ўсіх гандлёвых судоў, якія на момант вайны знаходзіліся ў расійскіх партах. 22 верасня 1914 г. быў падпісаны ўказ, які забараняў ажыццяўляць featurerознага кшталту здзелкі з нерухомай маёмасцю на імя падданых дзяржаў, якія знаходзіліся ў стане вайны з Расійскай імперыяй. Другі ж артыкул названага нарматыўнага актуануляваў права карыстання і распараджэння названым відам уласнасці [8, с. 213–214].

Выйсце са склаўшайся сітуацыі яшчэ было – прыняцце іншаземцамі расійскага падданства. Так, на тэрыторыі Беларусі напачатку Першай сусветнай вайны здолелі змяніць падданства (з аўстрыйскага на расійскае) браты Аляксандр і Леапольд Лур'е, якія валодалі перадавой фанернай фабрыкай у Пінску. А вось іншы пінскі бізнесмен – Іосіф Абрамавіч Гальперын, заснавальнік акцыянернага таварыства запалкавай фабрыкі «Прагрэс–Вулкан», захаваў вернасць аўстра-венгерскаму імператару Францу Іосіфу. Па законах ваеннага часу І. Гальперырын павінен быў быць накіраваны ў адзін з фільтрацыйных лагераў у Вятку ці Арэнбург. Аднак, у выніку ён пазбег пакарання, знікнуўшы ў невядомым напрамку.

З цягам часу прававое становішча іншаземных прадпрымальнікаў на тэрыторыі Беларусі ўсё больш пагаршалася. 11 студзеня 1915 г. была зацверджана Пастанова Савета міністраў, паводле якой дазвол на ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці ў Расійскай імперыі не мог быць дадзены падданым варожых краін, або гандлёвым дамам, у складзе якіх былі такія іншаземцы. Праўда, 8 сакавіка 1915 г. у названы закон было ўнесена адно дапаўненне. З гэтага часу, дзеянне Пастановы ад 11 студзеня 1915 г. не распаўсюджвалася на германскіх, аўстрыйскіх і венгерскіх падданых славянскага, французскага і італьянскага паходжання, а таксама на турак хрысціянскага веравызнання [9, с. 1123–1124].

2 лютага 1915 г. імператар Мікалай II дадаткова зацвердзіў яшчэ тры палажэнні, якія ўводзілі прынцыпова іншы парадак землеўладання і землекарыстання для аўстрыйскіх, венгерскіх, нямецкіх, турэцкіх пасяленцаў і прадпрымальнікаў, а таксама акцыянерна-паявых таварыстваў, заснаваных паводле заканадаўства краін, якія ўваходзілі ў Траісты саюз. Коратка можна звесці сутнасць гэтых палажэнняў да трох асноўных тэзісаў. Па-першае, у межах Расійскай імперыі забаранялася набыццё «варожымі элементамі» зямельнай маёмасці на правах карыстання і валодання. Тыя маёнткі, якія дасталіся асобам дадзенай катэгорыі ў спадчыну, павінны былі быць прададзены, а ў выпадку адмовы ад продажу – падлягалі ліквідацыі праз публічныя таргі. У заходняй частцы Расійскай імперыі, у тым ліку і ў беларускіх губернях, зямельная маёмасць усіх названых вышэй асоб, а таксама акцыянерна-паявых таварыстваў, размешчаная па-за межамі гарадской мясцовасці, падлягала выключна добраахвотнаму адчужэнню. Па-другое, расійскія падданыя – выхадцы з варожых краін і іх нашчадкі пазбаўляліся права ўласнасці, закладу, валодання і карыстання нерухомай маёмасцю ў сельскай мясцовасці. Па-трэцяе, у памежнай паласе, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, спыняліся правы землеўладання і землекарыстання для выхадцаў з варожых краін, якія былі расійскімі падданымі. Іх маёнткі адчужаліся па добраахвотных пагадненнях і прадаваліся з аўкцыёну. Праўда, у гэтай частцы выключэнне было зроблена для славян, праваслаўных і тых, хто прымаў удзел у Першай сусветнай вайне на баку Расійскай імперыі [10, с. 560–568].

У выніку распрацоўкі і прыняцця ўрадам Расійскай імперыі надзвычайнага заканадаўства адбылося істотнае скарачэнне дзелавой актыўнасці іншаземных падданых на тэрыторыі Беларусі. Так, у выніку прыняцця палажэнняў Савета міністраў ад 2 лютага 1915 г. толькі ў Мінскай губерні пад адчужэнне трапілі амаль 50 маёнткаў [11, арк. 156]. Шэраг прадстаўнікоў мясцовага дзелавога свету, якія амаль усё сваё свядомае жыццё прысвяцілі развіццю прадпрымальніцтва ў гэтым рэгіёне, падчас Першай сусветнай вайны былі пазбаўлены сваёй справы. У якасці прыкладу можна прывесці былога баварскага падданага Мікалая Лекерта, які разам са сваёй жонкай Паўлай і двума братамі Адамам і Францам займаліся вытворчасцю піва ў Мінскай і Магілёўскай губернях. Сам Мікалай нарадзіўся ў 1872 г. Магілёве [12, арк. 155; 13, арк. 100 адв. – 101], а на мяжы XIX–XX ст. прыняў расійскае падданства. Але гэты факт не вылатаваў яго ад падазрэнняў у сувязях з германскай выведкай, за што разам са сваім цесцем Юліусам Шлінгензіпенам у 1916 г. быў сасланы ў Іркуцкую губерню [14, арк. 8, 9, 13, 16, 17, 26].

Такім чынам, на працягу разгледжанага перыяду характар расійскай урадавай палітыкі ў адносінах да іншаземных прадпрымальнікаў на тэрыторыі Беларусі неаднаразова змяняўся. Лавіруючы паміж інтарэсамі мясцовых прадстаўнікоў дзелавога свету і агульнадзяржаўнымі інтарэсамі, улады Расійскай імперыі або надавалі больш свабоды іншаземным бізнесменам і кампаніям, або імкнуліся стрымаць замежную ініцыятыву. Але, нягледзячы на павароты ва ўрадавай палітыцы, іншаземцы на працягу XIX – пачатку XX ст. здолелі заняць уласную нішу ў гаспадарчым жыцці беларускіх губерняў. І толькі Першая сусветная вайна, пачатак якой суправаджаўся з'яўленнем надзвычайнага камерцыйнага права ў дачыненні да прадстаўнікоў варожых краін, негатыўна адбілася на далейшай дзелавой актыўнасці іншаземцаў на тэрыторыі Беларусі. У сукупнасці з іншымі фактарамі ўнутранага і знешняга характару гэта прывяло да заняпаду ў эканамічным жыцці дадзенага рэгіёну.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – Собр. 1-е: в 45 т. – СПб., 1830. – Т. 29. – № 22418. – С. 971–979.
2. ПСЗРИ. – Собр. 1-е: в 45 т. – СПб., 1830. – Т. 37. – № 28083. – С. 9.
3. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – СПб., 1862. – Т. 35. – Отд. 1. – № 35880. – С. 706–707.
4. ПСЗРИ. – Собр. 2-е: в 55 т. – СПб., 1867. – Т. 40. – Отд. 1. – № 41779. – С. 157–175.
5. Смирнов, С.А. Становление правового регулирования деятельности иностранных акционерных обществ в России во второй половине XIX века / С.А. Смирнов // Вестник ВолГУ. Серия 5: Юриспруденция. – 2005. – № 7. – С. 32–42.
6. ПСЗРИ. – Собр. 3-е: в 33 т. – СПб., 1889. – Т. 7. – № 4286. – С. 101–102.
7. Фабрично-заводские предприятия Российской империи. – Пг., 1914.
8. Поткина, И.В. Правовое регулирование предпринимательской деятельности в России, XIX – первая четверть XX в. / И.В. Поткина. – М.: Норма, 2009. – 304 с.
9. Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемое при правительствующем сенате. – 1915. – Отд. 1. – Перв. полугод. – № 90. – С. 1123–1124.
10. Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемое при правительствующем сенате. – 1915. – Отд. 1. – Перв. полугод. – № 39. – С. 560–568.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 311. – Воп. 1. – Спр. 49.
12. НГАБ. – Ф. 2389. – Воп. 1. – Спр. 15.
13. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 7282.
14. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 9328.